# * ВЫНІКОВАЕ АБАГУЛЬНЕННЕ

## Працуем з паняццямі

**1.** Размяркуйце прапанаваныя гістарычныя факты па графах табліцы. Растлумачце свой выбар.

*Адкрыццё Амерыкі, англійская рэвалюцыя, барацьба магнацкіх груповак, выданне «Псалтыры» Францыскам Скарынам, Грунвальдская бітва, «збіранне зямель рускіх», Крэўская унія, мануфактурная вытворчасць, неалітычная рэвалюцыя, паншчына, прамысловая рэвалюцыя, рэвалюцыя, самаізаляцыя Японіі і Кітая, славянізацыя балтаў, Трыццацігадовая вайна, узнікненне пісьменнасці, узяцце туркамі Канстанцінопаля, урбанізацыя, утварэнне Рэчы Паспалітай, феадальная раздробленасць, хрысціянізацыя беларускіх зямель.*

| Гістарычная падзея | Гістарычная з'ява | Гістарычны працэс |
|---|---|---|
| | | |

Дапоўніце табліцу прыкладамі гістарычных фактаў з гісторыі Беларусі ад найстаражытнейшых часоў да канца XVIII ст.

## Чытаем і пераўтвараем розныя віды тэкстаў

**2.** Выкарыстоўваючы стужкі часу, змешчаныя ў пачатку кожнага раздзела, і інфармацыю, пададзеную ў параграфах, выканайце наступныя заданні.

А. Назавіце асноўныя тэндэнцыі сацыяльнага, палітычнага, эканамічнага, духоўнага развіцця Беларусі ў дадзеныя перыяды. Вынікі запішыце ў табліцу.

| Перыяд | Асноўныя тэндэнцыі |
|---|---|
| Ад найстаражытнейшых часоў да V ст. н. э. | |
| V–XIII стст. | |
| XIV–XV стст. | |
| XVI–XVIII стст. | |

Б. Ахарактарызуйце асноўныя змены ў адной са сфер жыцця грамадства — эканамічнай, палітычнай, сацыяльнай, духоўнай, што адбываліся на тэрыторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст.

3. Складзіце медыяазбуку або распрацуйце віктарыну пра гістарычных асоб, якія зрабілі значны ўнёсак у развіццё беларускіх зямель. Выкарыстоўвайце розныя віды медыятэкстаў.

## ФРАГМЕНТ МЕДЫЯАЗБУКІ

Р



*Мініяцюра з Радзівілаўскага летапісу. Канец XV ст.*



*А. П. Ласенка. 1770 г. Алей. Дзяржаўны Рускі музей*





*Фрагмент балета «Страсці» Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь*

## ФРАГМЕНТ ВІКТАРЫНЫ

**Заданне.** Гэтая жанчына лічыцца сімвалам жаночага гонару, смеласці і непахіснасці







Тры Сафійскія саборы — Кіеўскі, Новагародскі і Полацкі — былі пабудаваны яе сынам, унукам і праўнукам



*А. П. Ласенка. 1770. Алей. Дзяржаўны Рускі музей*

За гэтую карціну мастак быў ушанаваны званнем акадэміка



У яе гонар названы сярэднепозні сорт бульбы, выведзены ў Беларусі ў 2011 г.

## Аналізуем, тлумачым, разважаем

**4.** Азнаёмцеся з пералікам гарадоў: *Навагрудак, Гродна, Нясвіж, Полацк, Крэва, Мінск, Тураў, Брэст, Ліда, Заслаўе, Слуцк*. Уключыце ў яго ваш населены пункт (раённы цэнтр), калі гісторыя яго ўзнікнення і развіцця адносіцца да IX–XVIII стст.

Вызначце, якую ролю адыгрывалі гэтыя гарады ў палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным развіцці беларускіх зямель у эпоху Сярэднявечча і ранняга Новага часу, выканаўшы прапанаваныя заданні.

А. Устанавіце першапачатковую назву кожнага горада і растлумачце версію паходжання тапаніміікі.

Б. Апішыце падзеі, у сувязі з якімі гэтыя гарады згадваюцца ў айчыннай гісторыі ў эпоху Сярэднявечча і ранняга Новага часу.

В. Як сёння ў гісторыка-культурнай прасторы гэтых гарадоў (назвы вуліц, помнікі, музеі, фестывалі і інш.) знаходзяць адлюстраванне апісаныя вамі падзеі?

**5.** Што, дзе і калі адбывалася — галоўныя пытанні, якімі кожны вучоны-гісторык пачынае вывучэнне мінуўшчыны. Але гэтага недастаткова, каб атрымаць поўнае ўяўленне пра гістарычныя падзеі, з'явы, працэсы. Вучонаму неабходна ведаць іх прычыны, узаемасувязі і наступствы.

Абярыце адну гістарычную падзею і прааналізуйце яе, выкарыстоўваючы разнастайныя тыпы пытанняў (не менш за два кожнага тыпу).

| **Пытанні, якія патрабуюць узнаўлення падзей, фактаў** | **Пытанні, накіраваныя на рэпрадукцыю працэсу** | **Пытанні, накіраваныя на выяўленне прычынна-выніковых сувязей** | **Пытанні, якія патрабуюць аналізу, сінтэзу, новых ведаў** |
|---|---|---|---|
| Што?<br>Хто?<br>Калі?<br>Колькі? | Як?<br>Якім чынам?<br>У выніку чаго? | Чаму?<br>У чым прычыны?<br>Якія наступствы? | Што агульнага?<br>У чым адметнасці?<br>Параўнайце ...<br>Дакажыце ... |

Вынікі аналізу прэзентуйце ў выглядзе «Паштоўкі з мінулага», у якой будуць змешчаны адказы на пастаўленыя пытанні.

**6.** Назавіце 10 найбольш значных, на ваш погляд, падзей з гісторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст. Абгрунтуйце свой выбар. Параўнайце свае вынікі з вынікамі аднакласнікаў.

## Параўноўваем

**7.** Беларусь знаходзіцца на стыку заходняй і ўсходняй цывілізацый. Які ўплыў аказвалі гэтыя цывілізацыі на тэрыторыю Беларусі на працягу вывучаных у 10-м класе гістарычных перыядаў?

## Сістэматызуем веды

**8.** Запоўніце табліцу «Дасягненні культуры Беларусі X–XVIII стст.». Якія культурныя дасягненні, на вашу думку, не ўвайшлі ў прадстаўлены пералік? Дапоўніце табліцу, растлумачце свой выбар.

| X — першая палова XIII ст. | Другая палова XIII — першая палова XVI ст. | Другая палова XVI — першая палова XVIII ст. | Другая палова XVIII ст. |
|---|---|---|---|
| | | | |

*«Малая падарожная кніжка» Францыска Скарыны, выраб крыжа на заказ Еўфрасінні Полацкай, стварэнне Эдукацыйнай камісіі, «Песня пра зубра» Міколы Гусоўскага, Тураўскае евангелле, будаўніцтва Сафійскага сабора ў Полацку, «Словы» Кірылы Тураўскага, будаўніцтва Лідскага замка, узвядзенне царквы Раства Божай Маці ў в. Мураванка, адкрыццё Віленскай езуіцкай акадэміі, выданне «Катэхізіса» Сымонам Будным, будаўніцтва палацавага комплексу Сапегаў у Ружанах, «Вялікае мастацтва артылерыі» Казіміра Семяновіча, «Раство Божай Маці» Пятра Еўсяевіча.*

**9.** Паразважайце наконт наступных праблемных пытанняў і заданняў.

А. Як вы разумееце выраз «ведаць гісторыю»? Ці дастаткова для гэтага ўмець пералічваць вялікую колькасць дат, паняццяў і імён, апісваць гістарычныя падзеі?

Б. Вылучыце крытэрыі, на падставе якіх можна зрабіць вывад, што чалавек ведае гісторыю.

В. У чым розніца паміж гісторыкам і чалавекам, які ведае гісторыю?

Г. Чаму для сучаснага чалавека важна ведаць айчынную і сусветную гісторыю?

Д. Напішыце эсэ на тэму «Нам ёсць чым ганарыцца, нам ёсць што берагчы» паводле вывучанага перыяду гісторыі.